# Кантроль аплаты праезду

У Мінскім метрапалітэне дзейнічае аўтаматызаваная сістэма кантролю аплаты праезду (АСКАП). Кантроль праходу пасажыраў на станцыю ажыццяўляецца з дапамогай аўтаматызаваных кантрольных пунктаў (АКП) – турнікетаў. АКП аснашчаны сродкамі, якія забяспечваюць кантроль аплаты праезду:

- жэтонапрыёмнік – для аплаты разавых паездак;
- счытвальнік бескантактных смарт-карт (валідатар) – для праверкі праязных білетаў на картах дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс»;
- счытвальнік бескантактных смарт-карт (радыёкарт) – для праверкі праязных білетаў на картах метрапалітэна.

Праверка дакументаў, якія прадастаўляюць права на бясплатны праезд, ажыццяўляецца кантралёрам аўтаматычных прапускных пунктаў. Дакументы ўстаноўленага ўзору, якія пацвярджаюць права на бясплатны праезд, прад’яўляюцца ў разгорнутым выглядзе.